Метнер А., студ. гр. 211 ФКіСКД
БГУКМ
Навуковы кіраўнік – Сівурава Л.П.,
дацэнт

# РАЗВІЦЦЕ БАЛЯЎ НА БЕЛАРУСІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Балем называецца вялікі танцавальны вечар. Балі адрозніваюцца ад звычайных танцаў ці дыскатэкі падвышанай урачыстасцю, этыкетам і класічным наборам танцаў у загадзя вызначаным парадку.

Пачатак баляў узыходзіць да свят пры французскім і бургундскім дварах. Першы баль, пра які маюцца звесткі ў гісторыі, быў дадзены ў 1385 г. у Ам’ене па выпадку шлюбу Карла VI з Ізабэлай Баварскай. У XV і XVI ст. вялікія танцавальныя забавы пры дварах і дваранскіх замках адбываліся даволі рэдка. Марыя Медычы ўпершыню перанесла ў Францыю маскарады. Шырокае распаўсюджанне балі атрымалі пры каралі Генрыху IV. Сапраўдную сваю форму балі захоўваюць з часоў Людовіка XIV, калі яны сталі ладзіцца ва ўсіх нямецкіх рэзідэнцыях. З тых часоў балі пачалі складаць істотную частку большасці прыдворных свят.

Французскі каралеўскі двора ў тую эпоху быў заканадаўцам мод, густу і свецкіх паводзін у Еўропе. Кароль, а таксама магнаты і багатая шляхта давалі балі з нагоды розных урачыстых падзей. Для іх правядзення патрабаваліся вялікія залы для танцаў, вячэры і дэсерта ды, акрамя таго, шэраг пакояў для дамскай уборнай, буфета з посудам, гульні ў карты і г. д. Танцавалі на балях абавязкова пад аркестр. Пачыналіся яны не раней, чым у дзевяць гадзін вечара і доўжыліся часам да трох гадзін ночы. Запрашэнні на баль рассылаліся за два-тры тыдні. Атрымаўшы запрашэнне, трэба было адказаць пісьмовай падзякай. Для кожнага балю Існавала цвёрда ўсталяваная праграма бальных танцаў. У XVIII ст. у Рэчы Паспалітай, як і ў каралеўскай Францыі, балі адкрываліся менуэтам. Але пасля Французскай рэвалюцыі і надышоўшых за ёю перамен у ладзе жыцця, светапоглядзе, адзенні, змянілася

і мода ў бальных танцах. Балі сталі пачынацца паланезам, затым ішлі ціхі менуэт і рэзвы контрданс.

Балі таксама атрымалі распаўсюджанне на беларускіх землях. У магнатаў Вялікага княства Літоўскага балі доўжыліся аж па некалькі тыдняў. Баль з’яўляўся самай урачыстай, шматлюднай і любімай святочнай формай баўлення часу магнатэрыі і багатай шляхты Рэчы Паспалітай у XVII—XVIII стст. Балі таксама карысталіся вялікай папулярнасцю сярод багатай часткі гарадскога насельніцтва беларускіх земляў, асабліва ў XIX — пачатку XX ст., калі Беларусь уваходзіла ў склад Расійскай імперыі [1, с. 243 – 244].

З перамогай Кастрычніцкай рэвалюцыі быў пакладзены пачатак карэнным пераўтварэнням у сферы вольнага часу. У перыяд станаўлення савецкай улады распаўсюджанне атрымалі сходы, мітынгі, масавая агітацыя і прапаганда, якія выкарыстоўваліся як сродак мабілізацыі народа. Свецкія формы баўлення вольнага часу, якія былі ўласцівыя арыстакратычнай частцы насельніцтва дасавецкага перыяду, не атрымалі развіцця [2, с. 98].

Традыцыя праводзіць балі на Беларусі стала адраджацца ў пачатку XXI стагоддзя. Яна выклікана цікавасцю да гісторыі і культуры беларускага народа, рэнесансам гістарычных форм баўлення вольнага часу, асабліва ў асяроддзі беларускай моладзі. Сярод мэт іх правядзення — развіццё альтэрнатыўных сучаснай клубнай масавай культуры форм сацыякультурных зносін, папулярызацыя культуры адносін, сямейных каштоўнасцяў.

Зараз значна вялікая частка баляў праводзіцца ў сталіцы Беларусі Мінску. Незвычайнае відовішча чакала мінчукоў і турыстаў ў пачатку жніўня 2009 года каля Хаты-музея Ваньковічаў. Летні баль арганізавалі энтузіясты з мінскіх клубаў, у якіх займаюцца рэканструкцыяй вопраткі і аднаўленнем традыцый XIX стагоддзя.

У 2010 годзе споўнілася 245 гадоў з дня нараджэння князя Міхала Клеафаса Агінскага. З нагоды гэтай даты адбыўся баль. Ён праводзіўся ў цэнтры сучаснага Мінску ва ўзноўленай Ратушы 9 кастрычніка 2010 года. Праект праходзіў у межах праекту “Музыка дынастыі Агінскіх” у Літве і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусі — краінах, што зараз існуюць на землях былой Рэчы Паспалітай. Цягам тыдня на канцэртах-прэзентацыях гучала музыка дынастыі Агінскіх у выкананні калектываў з Беларусі, Польшчы і Літвы [3].

Венскі баль у Мінску адбыўся 9 студзеня 2011 года ў Палацы культуры Мінскага аўтазавода. У сталічным Палацы "МАЗ" сабраліся заслужаныя майстры спорту, прызёры рэспубліканскіх конкурсаў, лаўрэаты міжнародных спаборніцтваў і лепшыя трэнеры па спартыўных бальных танцах. Таксама у мерапрыемстве ўдзельнічалі вядомыя сталічныя клубы бальнага танца.

Яшчэ адзін буйнамаштабны баль адбыўся напярэдадні Старога Новага года 13 студзеня 2011 года ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета. Святочны вечар быў напоўнены танцамі, музыкай, паэзіяй, розыгрышамі, жартамі і таямніцамі маскараду. Уся праграма была пабудавана такім чынам, каб госці сталі не толькі гледачамі, але і непасрэднымі ўдзельнікамі бальнага свята. Канцэртную праграму склалі выступленні вядучых артыстаў оперы, балета, хору, міманса, аркестра і дзіцячага музычнага тэатра-студыі. Апоўначы, калі гадзіны адзначылі пачатак Новага года па старым календары, танцавальную праграму прадоўжыў казачны венскі баль. Для гледачоў і ўдзельнікаў навагодняга свята ў адным з рэпетыцыйных залаў тэатра працавала імправізаваная школа бальных танцаў. Кожны чалавек, які набыў квіток на баль, меў магчымасць бясплатна навучыцца танчыць паланэз, вальс і польку[4].

6 лютага 2011 г. у Мінскім дзяржаўным Палацы дзяцей і моладзі прайшоў зімовы баль, які сабраў пары з розных гарадоў Беларусі. Удзельнікамі балю сталі каля 100 танцавальных пар з Мінска, Брэста, Гомеля, Бабруйска, Гародні, Кобрына, Віцебска і звыш 100 гасцей, сярод якіх былі прадстаўнікі Інстытута тэалогіі БДУ, клуба бальных танцаў "Мара", сталічнай харэаграфічнай школы №1, Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі "Ранак", а таксама святары мінскіх прыходаў і прадстаўнікі праваслаўных і свецкіх моладзевых арганізацый. Праграма складалася з трох танцавальных аддзяленняў: "Рускія сезоны", "Праменад па Заходняй Еўропе", а таксама

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“Танцы народаў свету”, удзел у якім прыняў ансамбль армянскіх танцаў “Эребуни”. У антрактах удзельнікаў балю цешыла жывая музыка, гульні, неспадзяванкі, прэзентацыя праваслаўных моладзевых арганізацый і г.д [5].

Такім чынам, баль сёння з’яўляецца запатрабаванай і актуальнай формай баўлення вольнага часу. Удзел у такіх мерапрыемствах дае магчымасць вывучаць сваю гісторыю, культуру, далучыцца да класічнага мастацтва.

Спіс скарыстаных крыніц:

1. Беларусы. Т. 6. Грамадскія традыцыі /В.Ф. Бацяеў, В.М. Бялявіна, А.У. Гурко і інш.; Рэдкал.: В.М. Бялявіна і інш.; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. – Мінск: Бел. Навука, 2002. – 606 с.: іл.

2. Грамадскі быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. В.К. Бандарчык, В.М. Бялявіна, С.І. Мілючэнка. Навук. рэд. В.К. Бандарчык. – Мінск, 1990. – 247 с.

3. У гонар князя Міхала Клеафаса ў Ратушы давалі баль [Электронный ресурс]. – 2012. □ Режим доступа: http://my-historica.org/2010/10/11/107. □ Дата доступа: 17. 04. 2012.

4. Зимний бал прошел в Минске [Электронный ресурс]. – 2012. □ Режим доступа: http://zn.by/zimnii-bal-proshel-v-minske.html. □ Дата доступа: 17. 04. 2012.

5. В Белорусском театре оперы и балета были даны русский и венский балы [Электронный ресурс]. – 2012. □ Режим доступа: http://www.mkdc.by/news/view/45. □ Дата доступа: 17. 04. 2012.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ